Радыё Свабода

ДЗЕНЬ ВОЛІ

У цэнтры Менску на Дзень Волі затрымалі палітыкаў і музыкаў. ФОТА, ВІДЭА

25 сакавік 2019, 18:00

АБНОЎЛЕНА 25 сакавік 2019, 22:44

Прынамсі восем чалавек, уключна з палітыкамі Мікалаем Казловым і Віталём Рымашэўскім, затрыманыя на Кастрычніцкай плошчы ў цэнтры Менску 25 сакавіка. За некалькі кварталаў ад яе затрыманыя музыкі Лявон Вольскі, Ігар Варашкевіч, Зьміцер Вайцюшкевіч і Павел Аракелян, якія рыхтаваліся да імправізаванага выступу на Камсамольскай вуліцы.

Ніякіх акцыяў на дзень або вечар 25 сакавіка ў Менску не анансавалі, але ў цэнтры сталіцы зранку дзяжурылі аўтазакі і «людзі ў цывільным». Апэратыўна атрымаць камэнтар менскай міліцыі не ўдалося.

Затрыманьні, пра якія вядома:

1. Алена Талстая
2. ~~Віталь Рымашэўскі~~
3. ~~Мікалай Казлоў~~
4. ~~Віктар Кавалькоў (айпец Вікенцій)~~
5. ~~Юры Палейка~~
6. ~~Міхаіл Савіцкі~~
7. ~~Андрэй Рогаў~~
8. ~~Сяргей Кісель~~
9. ~~Лявон Вольскі~~
10. ~~Мар'яна Вольская~~
11. ~~Зміцер Вайцюшкевіч~~

12. ~~Ігар Варашкевіч~~
13. ~~Павел Аракелян~~
14. Жанчына зь бел-чырвона-белым сьцягам

Абноўлена 21:40: З Цэнтральнага РАУС вызвалілі ўсіх затрыманых музыкаў і актывістаў. На дадзены момант затрыманая толькі Талстая — яе павезьлі на Акрэсьціна. На вызваленых не складалі пратаколы аб правапарушэньнях, толькі пратаколы аб затрыманьнях і прафіляктычных гутарках. Ці будуць суды і штрафы, невядома. Як расказаў Свабодзе Рымашэўскі, у адрозьненьне ад затрыманьня 24 сакавіка або Дню Волі мінулага году, на гэты раз зь ім абыходзіліся карэктна, бяз гвалту.

Абонўлена, 22:44: У цэнтры Менску схапілі жанчыну зь бел-чырвона-белым сьцягам.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
Вызвалілі затрыманых на Кастрычніцкай плошчы ў Менску. Алена Талстая застаецца на Акрэсьціна

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
Вызваленыя Вольскі, Варашкевіч, Вайцюшкевіч і Аракелян, якіх затрымалі на пешаходнай вуліцы ў Менску

Актывістка прыкавала сябе да слупа

Яшчэ да 18-й гадзіны на Кастрычніцкай плошчы затрымалі актывістку апазыцыйнага Руху салідарнасьці «Разам» **Алену Талстую**, яна прыкавала сябе кайданкамі да слупа, бо «Дзень Волі — у няволі».

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
Актывістка прыкавала сябе да слупа на Кастрычніцкай плошчы ў Менску. ФАТАФАКТ

Палітыкаў, якія не заклікалі да несанкцыянаваных мерапрыемстваў, затрымалі

На Кастрычніцкую плошчу завітаў былы старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Анатоль Лябедзька**, пазьней да яго падышлі цяперашні старшыня АГП **Мікалай Казлоў** і сустаршыня Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі **Віталь Рымашэўскі**. Яны падкрэсьлілі, што не заклікаюць да несанкцыянаваных захадаў — проста ідуць пакласьці кветкі да дому, дзе была абвешчаная незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі (вул. Валадарскага, 9).

Казлова і Рымашэўскага затрымалі менш як празь пяць хвілінаў без усялякіх тлумачэньняў. Падчас затрыманьня было бачна, што ў машыне «людзей у цывільным» ужо быў адзін затрыманы — сьвятар Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы **айцец Вікенці**.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
Старшыню АГП і сустаршыню БХД затрымалі на Кастрычніцкай плошчы ў Менску

Каля 18:15 затрымалі яшчэ аднаго чалавека ў бел-чырвона-белым шаліку на падыходзе да плошчы, ён не пасьпеў назвацца. Праз тры хвіліны затрымалі яшчэ двух чалавек — зь бел-чырвона-белым сьцяжком на плошчу выйшаў мужчына, які назваўся **Міхаіл Савіцкі**, да яго падышоў паразмаўляць яшчэ адзін мужчына, затрымалі абодвух. Пасьля быў затрыманы прынамсі яшчэ адзін чалавек.

Прадстаўнік праваахоўнікаў папрасіў журналістаў і назіральнікаў адыйсьці далей ад праспэкту, каб «не перашкаджаць людзям хадзіць па Кастрычніцкай плошчы».



Фотагалерэя: Затрыманьні на Дзень Волі ў цэнтры Менску. ФОТА

На Камсамольскай затрымалі Вольскага, Варашкевіча, Вайцюшкевіча, Аракеляна

Лявон Вольскі зь сябрамі зьбіраліся прагуляцца з музычнымі інструмэнтамі пешаходнымі вуліцамі ў цэнтры.

У 18.24 музыкаў **Лявона Вольскага**, **Зьмітра Вайцюшкевіча**, **Ігара Варашкевіча** і **Паўла Аракеляна** затрымалі на скрыжаваньні вуліц Камсамольскай і Рэвалюцыйнай. Затрыманая таксама жонка Лявона **Мар'яна Вольская**.

Адзін з арганізатараў канцэртаў #БНР100 і #БНР101 Антон Матолька запусьціў на Petitions.by збор подпісаў пад зваротам да Менгарвыканкаму і Міністэрству ўнутраных справаў з патрабаваньнем растлумачыць, чаму затрымалі музыкаў.

На скрыжаваньні засталіся дзясяткі чалавек, якія хорам прасьпявалі гіты Вольскага і гурту N.R.M «Тры чарапахі», «Паветраны шар», «Простыя словы» і іншыя песьні. Прадстаўнік міліцыі пагражаў ім затрыманьнямі і гвалтам, але людзі мірна разышліся.

Вуліца Валадарскага застаўленая аўтазакамі ад праспэкту Незалежнасьці.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
У цэнтры Менску запусьцілі фаервэркі з нагоды Дня Волі. ФОТА і ВІДЭА

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
Флэшмоб на Дзень Волі. Беларусы вывешваюць бел-чырвона-белыя сьцягі. ФОТА

Што важна ведаць пра Дзень Волі — 2019

- 1 сакавіка — Аляксандар Лукашэнка вусна забараніў сьвяткаваць Дзень Волі канцэртам на стадыёне «Дынама», як таго хацелі арганізатары #БНР100 — кажа: «Ідзіце на Бангалёр».
- 23 сакавіка ў Горадні — канцэрт у Калоскім парку з удзелам Зьмітра Вайцюшкевіча, Лявона Вольскага, гуртоў Nizkiz, «Крама», «Дай дарогу!» і Dzieciuki. Ад 3 да 5 тысяч гледачоў.
- 23–24 сакавіка — акцыі беларусаў у Варшаве, Вільні, Кіеве, Нью-Ёрку, Празе ды іншых гарадах.
- 24 сакавіка ў Менску — мітынг-канцэрт у Кіеўскім сквэры з удзелам «Дай дарогу», N.R.M., «Разьбітага сэрца пацана» ды іншых. Ад 1500 (паводле міліцыі) да 5–7 тысячаў (паводле арганізатараў) гледачоў. Затрыманыя Наталья Басалыга-Гарачка і Зьміцер Дашкевіч.
- 25 сакавіка ў Гомлі — акцыя памяці герояў БНР.

- 25 сакавіка ў Віцебску — адзіночны пікет Барыса Хамайды, які расцанілі як «парушэньне парадку ўтрыманьня населеных пунктаў».
- 25 сакавіка ў розных гарадах — людзі вывешвалі бел-чырвона-белыя сьцягі на заклік арганізатараў #БНР101, уладам не спадабалася.
- 25 сакавіка ў Менску на Кастрычніцкай плошчы — акцыя Алены Талстой (прыкавала сябе да слупа), затрыманьні палітыкаў і мінакоў. Праз тры гадзіны вызваленыя ўсе, акрамя Талстой, пратаколаў аб парушэньнях не складалі.
- 25 сакавіка ў Менску на пешаходных вуліцах — затрыманьні музыкаў (Аракелян, Вайцюшкевіч, Варашкевіч і Вольскі), якія анансавалі, што зьбіраюцца прагуляцца і ўзяць з сабой музычныя інструмэнты. Пасьля затрыманьня дзясяткі людзей сьпявалі хорам песьні Вольскага, міліцыя пагражала затрыманьнямі і гвалтам. Праз тры гадзіны музыкі вызваленыя.
- 25 сакавіка ў розных гарадах — салюты ў гонар Дня Волі.

Што яшчэ пачытаць, паслухаць, паглядзець пра БНР

- Праект Сяргея Шупы **«Падарожжа ў БНР»** (тэкст + аўдыёпадкасты) і аднайменная кніга (PDF)
- 10 малавядомых месцаў на мапе Беларусі, зьвязаных з БНР
- Беларускае «Слова 2018 году» — БНР
- Дзень Волі — 2018 стаў самым масавым у 21 стагодзьдзі. ІНФАГРАФІКА